# Ігуменскі тракт



№ 36 (51)

■ Славуты зямляк

## ПРЫЙДЗЕМ ТАБЕ ПАКЛАНІЦЦА

*Газета «Звязда» сумесна з Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь распачынае праект па ўшанаванні славутых землякоў. Па ініцыятыве дэпутата Уладзіслава Цыдзіка першай асобай, якой будзе аддадзена належная даніна памяці, стане Адольф Янушкевіч. Гэты дзеяч, што родам з-пад Дзяржынска, зрабіў значны ўнёсак у развіццё не толькі нашай краіны, але і Казахстана, Польшчы, Расіі.*

*1 лістапада ў горадзе Дзяржынску і вёсцы Дзягільна, што побач з ім, пройдуць літаратурныя чытанні, урачыстае ўскладанне кветак, абмеркаванне лёсу славутай асобы. Прыедзе сюды і дэлегацыя з Казахстана, каб ушанаваць месца нараджэння і спачыну чалавека, якога яны лічаць і сваім героем.*

**Сёлета споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння падарожніка-этнографа, перакладчыка, пісьменніка Адольфа Янушкевіча.**

Ці мог спадзявацца ў пару сваёй вялікай падзвіжніцкай дзейнасці Адольф Янушкевіч, што праз стагоддзі яго імя будзе вядома адразу ў чатырох краінах, што яго працы будуць прызнаны як уклад у беларускую, рускую, польскую, англійскую, украінскую, казахскую культуры?..



Прычым цяжка вызначыць, дзе яго зорка гарыць ярчэй: у Польшчы, за адстойванне годнага лёсу якой ён быў пазбаўлены шляхецтва і маёмасці; у Расіі, што стала школай жыцця амаль на чвэрць стагоддзя; у Казахстане, дзе праявіўся яскравы талент летапісца; або ў Беларусі, адкуль пачаўся шлях у вялікі свет і дзе знайшоў апошні прытулак нястомны рупліўца.

Нарадзіўся Адольф Янушкевіч у Нясвіжскім замку 9 чэрвеня 1803 года. Слынная магнацкая сталіца стала той калыскай, дзе яму перадаліся лепшыя рысы талерантнага менталітэту беларусаў, дзе зарадзілася спагадлівае стаўленне да людзей. Усё гэта пазней адлюстравалася ў найвышэйшай павазе да казахскага народа, з прадстаўнікамі якога ён пазнаёміўся падчас ссылкі. У сібірскім Омску Янушкевіч працаваў у памежным упраўленні па справах з сібірскімі кіргізамі (продкамі сучасных казахаў), часта ездзіў з даручэннямі ў іх аулы. Яго прадбачлівыя словы, сказаныя ў сярэдзіне XIX стагоддзя, паказваюць глыбокае разуменне гістарычнай ролі казахаў: «Народ, які адораны тварцом такімі здольнасцямі, не можа застацца ў баку ад цывілізацыі: дух яе калі-небудзь пранікне ў кіргізскія пустыні, разнясе тут праменьчыкі святла, і прыйдзе час, калі намад, які сёння качуе, зойме ганаровае месца сярод народаў...»

Імя Адольфа Янушкевіча і сёння служыць сімвалам патрыятызму. Ён яскравы прадстаўнік той апантанай моладзі часоў дзекабрысцкага руху, якая гонар, сумленне, вернасць Радзіме ставіла вышэй за ўсе выпрабаванні і цяжкасці, якая праяўляла нязломнасць характару, нават калі гучаў смяротны прыгавор.

Адольф Янушкевіч наўмысна не ўступіў у шлюб са сваёй каханай Стэфаніяй. Ён, як сапраўдны мужчына, не мог змірыцца з тым, што жонка, нашчадкі таксама будуць несці «пячатку» яго пакарання. Бо за ўдзел у паўстанні 1830-1831 гадоў Янушкевіч быў пазбаўлены дваранства і ўсіх прывілеяў.

Наш зямляк — прыклад таго, як не скарыцца перад цяжкімі ўдарамі лёсу. Узор цярплівасці і ўнутранай сілы. Умовы жыцця сібірскага ссыльнага ён скарыстаў для ўзмацнення духу цэлага народа.

Хіба мог ён тады ацаніць сваю ролю ў папаўненні скарбаў сусветнай культурнай спадчыны, зразумець уласную значнасць у наладжванні ўзаемаразумення паміж народамі? Моцны ўнутраны стрыжань падказваў яму, што рабіць: вывучаць мову народа, да якога прыкіпеў усёй душой, і рухацца наперад — у дзікі стэп, пераадольваць адлегласці, якія былі нялёгкімі нават для казакаў Сібірскага казачага войска, звыклых да доўгіх паходаў. Гістарычныя працы, створаныя Адольфам Янушкевічам, не маюць сабе роўных, паколькі работ па гісторыі Казахстана XIX стагоддзя амаль няма.

Талент нашага знакамітага земляка рэалізаваўся далёка па-за межамі роднай краіны. Аднак сваёй дзейнасцю ён прадэманстраваў усяму свету: вось якія яны, беларусы, людзі высокага гатунку.

Пахаваны Янушкевіч на сямейных могілках у вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна побач з маці Тэкляй, пляменнікамі Марыляй, Міхаілам і дзецьмі брата Януарыя.

Казахстанскі рэжысер Сяргей Шафір, які жыве ў Ізраілі, адзін з сюжэтаў свайго дакументальнага фільма «Урокі польскага» прысвяціў Адольфу Янушкевічу. Зараз ён мае матэрыял для стварэння асобнага фільма пра нашага земляка. На думку Сяргея Шафіра, гэта можа быць сумесны гісторыка-культурны праект Беларусі, Польшчы, Казахстана і Расіі.

**Алена СТЭЛЬМАХ**

■ Мясціны, знітаваныя з душой

# БЕЛЫЯ БАЛОТЫ

**Багатая гродзенская зямля здаўна прыцягвала да сябе людзей. У нашай мясцовасці параўнальна някепска захавалася некалькі сядзібна-паркавых комплексаў, якія знаходзяцца на адной з дарог да перліны Гродзенскага краю — Аўгустоўскага канала. У некаторыя з іх — такія, як Свяцк магнатаў Валовічаў, Свяцк Гурскіх, — сёння прадпрымальнікі стараюцца ўдыхнуць новае жыццё. А вось былы панскі дом Тукалаў і вялікі парк, які прылягаў да панскай сядзібы, пакуль што чакаюць свайго адраджэння...**



Па планіроўцы дом Тукалаў нагадвае традыцыйную хату: яшчэ адзін пакой, пакой і сені, якія мелі выхад на парадны ганак і гаспадарчы двор. Будавалі дом мясцовыя цесляры, якія мелі багаты вопыт і ведалі традыцыі. Унутранае аздабленне дома адпавядала тагачаснай еўрапейскай модзе. У буфетах і пасудных шафах быў дарагі фарфор, шкло, крышталь. Лічылася модным вырошчваць экзатычныя расліны, мець свой міні-звярынец. Неад'емным элементам аздаблення панскага дома былі кафельныя печкі.

Першыя звесткі аб існаванні маёнтка Белыя Балоты знаходзім у матэрыялах 2-й паловы XVIII стагоддзя. Паводле дакументаў парафіяльнага архіва Селіванаўскага касцёла, у 1798 годзе маёнткам валодаў Ян Мароз, суддзя былога Гродзенскага павета. 22 мая 1806 года прадаў яго канюшнаму Альберту Сабалеўскаму. А ўжо праз год, паводле геаграфічнага слоўніка польскіх зямель, быў прададзены Войцеху Сабалеўскаму. Багацеі Сабалеўскія прымалі чынны ўдзел у грамадска-гаспадарчым жыцці ваколіц. Графіня Сабалеўская ў 1865—1867 гадах з'яўлялася фундатарам будовы касцёла ў Селіванаўцах, які стаў месцам радавога пахавання іх сям'і. Недзе ў пачатку XX стагоддзя апошні з Сабалеўскіх прайграў маёнтак у карты пану Тукалу і ажаніў яго са сваёй дачкой.

Старажылы Белых Балот яшчэ расказваюць, што ў іх вёсцы жыў пан Тадэвуш Тукала са сваёй жонкай і 5 дзецьмі, які родам быў з гэтай мясцовасці. Бытуе легенда, што памесце называецца Белыя Балоты таму, што пан у гонар сваёй каханай Ядвісі загадаў засадзіць балоты, якія знаходзіліся за маёнткам, белымі лілеямі...

Каля іх дома знаходзіліся баракі і чваракі — жыллё для наёмнай сілы. Пан Тадэвуш быў добры гаспадар, працалюбівы, акуратны. Усе гаспадарчыя работы ляжалі на яго плячах. Старажылы-пакаёўкі расказваюць, што ён добра ставіўся да людзей, шчодра плаціў. Да яго ішлі на працу з ахвотай. Вельмі любіў дзяцей. Калі яму прыходзілі дапамагаць дзеці з вёскі, то даваў гасцінцы, уключаў паслухаць патэфон, дазваляў паглядзець жывёл у звярынцы. Пані, па ўспамінах мясцовых, была капрызная, але вельмі любіла музыку, кветкі, птушак.

Дачка Тукалаў Марыя-Гэлена ліха ездзіла на галандскіх скакунах, любіла паляванне, ладзіла адпачынкі каля начных кастроў, паходы, катанне на лодках па Аўгустоўскім канале. Пазней выйшла замуж у суседні маёнтак Гурскіх. У 30-я гады XX стагоддзя на прафесійнай аснове яна наладзіла агратурызм, які значна папоўніў казну маёнтка, выратаваў яго ад банкруцтва.

**Каля памесця быў разбіты ружоўнік з сотнямі сартоў руж, прывезеных з-за мяжы. Побач, у клетках, жылі паўліны, па двары бегалі цацаркі. Пан вельмі ганарыўся звярынцам, заўсёды паказваў яго гасцям — багацеям, якія наведвалі маёнтак.**



Каля памесця быў разбіты ружоўнік з сотнямі сартоў руж, прывезеных з-за мяжы. Побач, у клетках, жылі паўліны, па двары бегалі цацаркі. Пан вельмі ганарыўся звярынцам, заўсёды паказваў яго гасцям — багацеям, якія наведвалі маёнтак.

Парк у Белых Балотах быў створаны ў 2-й палове XIX стагоддзя. Ён знаходзіцца ў выгіне невялікай рачулкі Беліца. На ўскрайку — арыгінальныя гаспадарчыя мураваныя пабудовы. Кажуць, што гэта сушыльня і гарэльня. У сушыльні сушылі тытунь, які вырошчваў пан Тукала. На паўночным баку захавалася сценка, складзеная з каменю, якая аддзяляла парк і сад ад іншых насаджэнняў. Да нашага часу захавалася некалькі лістоўніц. Некаторыя дрэвы — самі па сабе помнікі прыроды. Вольхі ў ахопе складаюць 3,4 метра, ліпы — 3,1 метра. У парку і цяпер ёсць даволі шмат розных відаў вінаградных слімакоў, прывезеных панам з-за мяжы і штучна разведзеных тут у 30-я гады XX стагоддзя. За паркам — невялікі сад, да якога прымыкае ліпавая алея. Праўда сёння сад па загадзе мясцовых улад выкарчаваны.

Старажылы ўспамінаюць: «Парк быў дагледжаны. За рэчкай Беліца ўсе дарожкі былі пасыпаны жоўтым пяском, стаялі столікі і лаўкі, а ў рацэ, у празрыстай вадзе, вадзілася розная рыба.

Сучасны стан парка патрабуе адраджэння. Тут і цяпер растуць старыя лістоўніцы, ліпы-веліканы, дубы-помнікі, высачэзныя грабы. Унізе мноства кветак і лекавых траў: барвенак, сон-трава, чыстацел, піжма, чабор, святаяннік, ветраніца баравая — многія з іх занесены ў Чырвоную кнігу.

Вясной здзічэлы парк напаўняецца шматгалоссем. Мноства птушак насяляюць яго. У дуплах старых дрэў водзяцца совы, сіваваронкі, жоўны, дзятлы рознай афарбоўкі, стрыжы, сойкі, зязюлі, зімародкі і іншыя.

— Крыўдна, — кажуць мясцовыя жыхары, — што сёння парк страціў былую прывабнасць. А хацелася б, каб як і раней ён цешыў вока наведвальнікаў. Спадзяёмся, што з часам знойдуцца добрыя рукі, якія навядуць тут парадак. І турысты, якія едуць да Аўгустоўскага канала, змогуць спыніцца, пачуць расповеды экскурсаводаў пра жыццё і побыт былых уладальнікаў, даведацца, што тыя былі дбалымі гаспадарамі, наватарамі, эксперыментатарамі...

Пасля прыходу савецкіх войскаў пан Тукала ўцёк на Захад. Сын Яўген памёр яшчэ ў польскі час, Міхаіл быў забіты ў 1938 годзе ўласным парабкам. Астатнія, як і бацька, збеглі ў Еўропу.

У 1955 годзе, каб наведаць сваю былую сядзібу, прыязджаў з Варшавы ўнук Тадэвуша Тукалы. Ён быў моцна расчараваны, што прыгожы, дагледжаны раней маёнтак і парк цяпер такія запушчаныя. У былой сядзібе сёння знаходзяцца клуб і бібліятэка.

**Марыя ХРАМЛЮК**

■ Брэнд краіны

# «КАЙФ АД НАРОДНЫХ КАСЦЮМАЎ»

**Народны касцюм «ужывую» я бачыла гадоў 10—15 таму. Да бабулі ў вёску ў Валожынскім раёне прыязджаў хор з суседняга раёна, спяваў у самай вялікай хаце. Апрануты ўсе жанчыны (ды і некалькі мужчын) былі па-народнаму. Здаецца, усе падобныя, але ў кожнай нечым адметны народны касцюм. Я разглядвала іх колеры, узоры, крой і спрабавала вырашыць, які ж мне падабаецца больш... Шмат часу прайшло з той пары. Сёння калі і сустракаю каго ў народным, дык хіба што на фэсце этнамузыкі — хлопцаў у вышываных кашулях, якія прыбраліся так, каб прайсці бясплатна. Але аднойчы і мне самой пашчасціла весці канцэрт, апрануўшы аўтэнтычны мотальскі строй. Адчуванні былі найлепшыя: у летнюю спёку такая сукенка, што прыкрывае ўсе часткі цела, неверагодна лёгкая, і яе быццам на табе няма...**

А нядаўна я даведалася, што намітка, якую насілі нашы прабабулі, — не проста галаўны ўбор. Гэта, аказваецца, сапраўдны ліфтынг! Каб правільна завязаць яе, патрэбна гадзіна. А зрабіўшы ўсё дасканала, адчуваеш, што скура на твары добра падцягнутая. Такі вось народны рэцэпт маладосці.

Дзяўчат у народных касцюмах сёння можна сустрэць на многіх мерапрыемствах. Яны падносяць хлеб-соль шаноўным гасцям. Прыгажуні, апранутыя ў сукенкі з вышытымі кветкамі, уручаюць падарункі ад імя кіраўніцтва краіны. Аднак дома, у маладых сем'ях, наўрад ці знойдзеш народныя строі. Нават тыя, якія можна было б атрымаць ад сваіх бабуль і дзядуляў, хутчэй за ўсё, так і ляжаць у кутах старых шаф і на гарышчах. Маладыя спадчыннікі могуць і не здагадвацца пра іх існаванне. Атрымліваецца, з надыходам XXI стагоддзя сваё, народнае, нам стала не патрэбна? Няўжо не мае яно ніякай каштоўнасці ў вачах сучасных беларусаў?..

Шмат разважала на гэтую тэму **дырэктар УП «Скарбніца» Марыя ТАРАЙКОВІЧ.** Не ўтойваючы эмоцый, яна падзялілася імі з карэспандэнтамі «Звязды»:

**Правільна завязаная намітка — найлепшы ліфтынг для твару.**

— Многія сёння кажуць: «А навошта нам захоўваць і адраджаць народныя промыслы? У нас усё механізаванае». Аднак я ўпэўнена, што людзям патрэбна энергетыка, якая зыходзіць не ад машыны, а ад чалавечых рук. Каб праз колькі гадоў нехта ўспомніў, што ёсць у нас, напрыклад, ткацтва — ramізнае, закладное, бранае, ажурнае, падвойнае... Промыслы ўвасабляюць нашу народнасць. І, калі ў грамадстве ніхто нічога пра іх не ведае, — гэта бяда.



Марыя Тарайковіч выступае супраць такога забыцця. «Скарбніца», якую яна ўзначальвае, з'яўляецца адзіным прадпрыемствам, што сумяшчае і навуковую дзейнасць, і вытворчасць. Яе супрацоўніцы кожны год выпраўляюцца ў этнаграфічныя экспедыцыі, даследуюць аўтэнтычныя ўзоры, тэхналогіі — дасканала вывучаюць, як рабіў народ. Толькі пасля гэтага на прадпрыемстве яны ствараюць мадэлі народнага адзення і самі вырабляюць іх.

Часам нічога прыдумваць увогуле не даводзіцца. Можна проста адшукаць рэч у вясковым куфэрку, дакладна паўтарыць, і яна будзе жаданай у гардэробе самай патрабавальнай модніцы.

Нядаўна з экспедыцыі прывезлі світку. Нават світкай яе назваць было складана: проста з'едзеная моллю ануча, знойдзеная ў бабулі на гарышчы. Яе расклалі, распаролі. Дакладна па ўзору зрабілі лёгкае цёмна-зялёнае жаночае паліто (уні-



зе ззаду на ім вузкія доўгія складкі, накшталт сучаснага плісэ, толькі цалкам зробленыя ўручную). І ўжо не адна жанчына замовіла яго сабе. Мадэль, якая перажыла, магчыма, не адно стагоддзе, аказалася дарэчы ў сучасным гардэробе. І гэта дакладная рэканструкцыя!

**Мадэль світкі, якая перажыла не адно стагоддзе, аказалася дарэчы ў сучасным гардэробе.**

Марыя Тарайковіч адзначае:

— Пабыўшы ў нацыянальным касцюме, ты робішся іншым. Уплывае энергетыка вышытых знакаў. Жанчына робіцца статнай. Ну проста каралева! Таму хацелася б, каб усе мы атрымлівалі кайф ад народных касцюмаў.

Ёсць некаторыя фірмы, якія замаўляюць у «Скарбніцы» народныя кашулі для сваіх супрацоўнікаў, — праўда, просяць вышыць на іх яшчэ і эмблему прадпрыемства. У такім выглядзе могуць пайсці, напрыклад, на карпаратыў. Аднак такіх свядомых прыхільнікаў народнай культуры зусім не шмат.



Раней, калі дзяўчаты ткалі сабе пасаг, яны пачыналі рабіць гэта ў 12 гадоў, каб да 18 усё было гатова. Бо і вышыўка, і ткацтва — надзвычай працаёмкі працэс. Нічога не змянілася і сёння (зразумела, калі адзенне робіцца рукамі). Напрыклад, мужчынскую кашулю трэба вышываць месяц. Магчыма, таму і не вельмі даступная яна шырокаму колу спажыўцоў.

Аднак міжволі ўзгадваецца ўкраінская сталіца. Усе цэнтральныя ўнівермагі там запоўнены нацыянальным адзеннем, адаптаваным да сучаснасці. Людзі з задавальненнем ходзяць па вуліцах Кіева ў народных вышыванках.

Беларускія крамы не прапануюць нацыянальных кашуль на любы густ, якія можна было б насіць кожны дзень. З пакалення ў пакаленне любоў да свайго, адметнага у нас чамусьці амаль не перадаецца. Людзі не да канца ўсведамляюць, хто яны, проста не маючы на руках фактаў сваёй адметнасці. Але багатая традыцыя народнага касцюма ў гэтай справе магла б адыграць вельмі важную ролю:

**У летнюю спёку мотальская сукенка неверагодна лёгкая, яе быццам на табе няма...**

— Нацыянальная годнасць павінна перадавацца ў спадчыну ад бацькоў, — кажа дырэктар «Скарбніцы». — Я вельмі хацела б сказаць: «Людзі, прачніцеся!» Візітная картка любога народа — нацыянальны касцюм. Таму на ўсіх святах хацелася б бачыць людзей, апранутых па-народнаму...

Здаецца, надышоў час нарэшце звярнуць увагу на саміх сябе. Іначай многае мы беззваротна страцім. Забываючы пра нацыянальны касцюм, які вырабляўся толькі з прыродных матэрыялаў, сёння мы часта носім сінтэтычнае адзенне, якое зімой настывае, а летам пячэ, — магчыма, таму і хварэем часта. Адмаўляючыся ад глыбока сімвалічных узораў арнаменту, выбіраем малюнкі і колеры, якія нічога не значаць і ніяк не тлумачацца. Быць можа, замест таго, каб зноў апранацца ў штосьці шараговае, лепш хаця б час ад часу насіць рэчы, зробленыя з любоўю і мудрасцю?..

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
**Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ**